МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

ЛЯЎКО Анастасія Аляксандраўна

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ПРЫНЦЫПАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ КАМПАНІЙ

Дыпломная работа
АНАТАЦЫЯ
Спецыяльнасць 1-23 01 15 Сацыяльныя камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
кандыдат філасофскіх навук,
дацэнт Ю.Ю.Гафарава

Мінск, 2025

# АНАТАЦЫЯ

Структура дыпломнай работы складаецца з увядзення, трох раздзелаў і заключэння. Першая глава тэарэтычная, у ёй раскрываецца паняцце феномена сацыяльнай адказнасці і яго сутнасць. Другая глава таксама тэарэтычная, у ёй раскрываюцца розныя метады і кірункі рэалізацыі ініцыятыў у сферы сацыяльнай адказнасці бізнесу. Трэцяя глава з’яўляецца практычнай, у ёй вылучаны асноўныя кірункі і ініцыятывы, у якіх рэалізуюцца прынцыпы сацыяльнай адказнасці такіх банкаў, як МТБанк, БелВЭБ, Альфа-Банк і Сбербанк, а таксама розныя падыходы да брэндынгу сучаснай арганізацыі. Аб'ём дыпломнай работы складае 52 старонкі і ўключае 3 дадаткі і 31 выкарыстаныя крыніцы.

Ключавыя словы: сацыяльная адказнасць бізнесу, сацыяльныя ініцыятывы, беларускія кампаніі, кантэнт-аналіз, тэматычны аналіз.

Аб'ект дыпломнай работы – карпаратыўная сацыяльная адказнасць беларускіх кампаній.

Прадмет дыпломнай работы – рэалізацыя прынцыпаў сацыяльнай адказнасці ў дзейнасці беларускіх банкаў.

Мэта дыпломнай работы – вызначыць ключавыя напрамкі рэалізацыі прынцыпаў карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці беларускіх кампаній.

Метадалагічную аснову дыпломнай працы склалі метады кантэнт-аналізу і інтэрв’юіравання.

У працэсе напісання дыпломнай работы былі атрыманы наступныя вынікі: праведзены аналіз тэарэтычных аспектаў карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці (КСА), уключаючы яе эвалюцыю, асноўныя падыходы і матывацыйныя фактары. Даследаваны практыкі рэалізацыі КСА ў дзейнасці беларускіх банкаў (МТБанк, БелВЭБ, Альфа-Банк і Сбербанк) з выкарыстаннем метадаў кантэнт-аналізу і тэматычнага аналізу інтэрв'ю. Вызначаны ключавыя напрамкі сацыяльных ініцыятыў, а таксама іх успрыняцце аўдыторыяй, што дазволіла распрацаваць рэкамендацыі па ўдасканаленні камунікацыйных стратэгій у сферы КСА.

Навізна атрыманых вынікаў абумоўлена недахопам тэарэтычных і практычных ведаў адносна рэалізацыі прынцыпаў КСА ў сферы беларускага бізнесу, які спалучае дзяржаўны і прыватны сектары. У працы ўпершыню праведзены комплексны аналіз КСА-практык вядучых беларускіх банкаў з улікам сучасных ESG-трэндаў, а таксама дасьледавана ўспрыняцце гэтых ініцыятыў кліентамі банкаў. Асаблівую навуковую каштоўнасць уяўляе выяўлены дысананс паміж рэальнай сацыяльнай актыўнасцю банкаў і яе ўспрыняццем грамадствам, што дазволіла распрацаваць практычныя рэкамендацыі па павышэнні эфектыўнасці камунікацыі ў сферы КСА.

Матэрыялы і вынікі дыпломнай работы былі атрыманы на падставе дакладных крыніц і самастойна праведзеных тэарэтычных і практычных даследаванняў.

Матэрыялы дыпломнай работы могуць прымяняцца ў навучальным працэсе.